# *§ 22–0. Духоўнае развіццё цывілізацый у Познім сярэднявеччы

**1. Ерасі.** У Сярэднія вякі, асабліва ў XI–XV стст., у Еўропе з'явілася мноства рэлігійных рухаў, якія выступалі з крытыкай каталіцкай царквы, яе раскошы, багацця і ўлады. Гэтыя рухі называліся ератычнымі, бо іх ідэі супярэчылі афіцыйнай дактрыне каталіцкай царквы. Пры гэтым паслядоўнікі ерэтычных рухаў, як правіла, імкнуліся не разбурыць хрысціянства, а вярнуць яго да прастаты і сапраўднай веры ў іх разуменні. Яны выступалі за простае і праведнае жыццё, часам прапаноўвалі новыя погляды на хрысціянства.

Царква лічыла ерэтыкоў пагрозай, бо тыя аспрэчвалі яе ўладу і багацце, ставілі пад сумнеў яе вучэнне. Для барацьбы з імі ў XIII ст. была створана *інквізіцыя* — спецыяльны орган каталіцкай царквы, які выяўляў і караў ерэтыкоў. Царква арганізоўвала крыжовыя паходы, інквізіцыйныя суды, масавыя смяротныя пакаранні.



*Катаванні, узаконеныя царквой. Гравюра. 1508 г.*

Чаму царква змагалася супраць ерасей?

Нягледзячы на пераслед, ідэі ерэтыкоў не зніклі. Яны падрыхтавалі глебу для Рэфармацыі, якая ў XVI ст. змяніла хрысціянскую Еўропу. Крытыка

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

Найбольш вядомыя і радыкальныя сярод рэлігійных рухаў — катары, альбігойцы, вальдэнсы, лаларды і іншыя.

1. *Чаму шмат якія з гэтых ерасей паўсталі менавіта ў Сярэднія вякі?*
2. *Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы, сфармулюйце асноўныя патрабаванні сярэдневяковых ерасей.*
3. *Абярыце адну з ерасей (катары, альбігойцы, валенсы або лаларды) і падрыхтуйце паведамленне пра гісторыю яе з'яўлення, асноўныя палажэнні вучэння і прычыны наступнага царкоўнага і дзяржаўнага пераследу.*

царкоўнай раскошы і ўлады, неабходнасць рэформы царквы, пераасэнсаванне ролі Бібліі, імкненне спасцігнуць Бога без пасрэднікаў і многае іншае — усё гэта знайшло працяг у пратэстанцкай Рэфармацыі.

**2. Заняпад папства.** Сярэднявечча было часам магутнай каталіцкай царквы, але таксама і перыядам крызісаў, аслаблення папскай улады і глыбокіх канфліктаў. У Раннім сярэднявеччы рымскія папы мелі надзвычайны ўплыў, падпарадкоўвалі сабе каралёў і феадальную знаць. У XIII–XV стст. папства сутыкнулася з унутранымі праблемамі, супраціўленнем манархаў і ростам незадаволенасці грамадства. Гэтыя фактары прывялі да паступовага заняпаду ўплыву рымскіх пап.

Пасля падзелу Каралінгскай імперыі ў IX ст. надышоў перыяд палітычнай раздробленасці ў Заходняй Еўропе. Рымскія папы страцілі ранейшую ўладу над феадаламі. Яны апынуліся ўцягнутымі ў міжусобныя войны; феадалы захоплівалі папскія землі, а ў Германскай імперыі папы часцяком рабіліся стаўленікамі імператараў. Усё гэта мела вынікам секулярызацыю царквы і памяншэнне яе аўтарытэту.



*Рымскі папа Грыгорый VII. «Жыцціе Грыгорыя VII». Павел Бернрыдынскі. Першая палова XII ст.*

Аднак духавенства імкнулася супрацьстаяць негатыўным працэсам у каталіцкай царкве. Так узнік рух рэформаў на чале з абацтвам Клюні (Францыя). Рух гэты падпарадкоўваўся непасрэдна па́пу. Клюнійскія рэформы мелі мэтай умацаваць папскую ўладу, забараніць продаж царкоўных пасад і абмежаваць умяшанне свецкіх улад у царкоўныя справы. У сценах абацтва паўстала адна з найбольш уплывовых постацей у гісторыі каталіцкай царквы — папа *Грыгорый VII* (1073–1085 гг.), які фактычна ўзначальваў Ватыкан з 1059 г. Ён рэфармаваў выбары пап, вызваліў іх ад свецкага ўплыву, увёў *цэлібат* — бясшлюбнасць для духавенства — і выступаў за вяршэнства папы над свецкімі ўладамі. Асаблівую вастрыню мела яго барацьба з германскім імператарам Генрыхам IV, якога ён прымусіў з'явіцца ў Каносу з пакаяннем. Папа

двойчы адлучаў і звяргаў імператара. Гэтае супрацьстаянне прывяло да палітычных канфліктаў і завяршылася паражэннем Грыгорыя VII, які быў вымушаны збегчы з Рыма.

У XIII ст. манархі Еўропы ўзмацнілі барацьбу за незалежнасць ад папства. Французскі кароль Філіп IV Прыгожы напачатку XIV ст. уступіў у адкрыты канфлікт з папам Баніфацыем VIII, які спрабаваў забараніць абкладаць духавенства падаткамі. У 1303 г. войскі Філіпа захапілі папу ў Ананьі. Гэтая падзея ператварылася ў сімвал аслаблення папскай улады.

Пасля смерці Баніфацыя VIII папы былі вымушаны пераехаць у Авіньён (поўдзень Францыі), дзе апынуліся пад кантролем французскіх каралёў. Гэты перыяд вядомы як *«Авіньёнскае паланенне» (1309–1377 гг.)*. Сем пап, якія кіравалі з Авіньёна, страцілі аўтарытэт сярод еўрапейцаў, бо лічылася, што яны слугуюць інтарэсам Францыі, а не ўсёй каталіцкай царквы. У выніку ўзмацнілася незадаволенасць сярод вернікаў і палітычных дзеячаў тагачаснай Еўропы, што падарвала прэстыж папства.

У 1377 г. папа Грыгорый XI вярнуўся ў Рым, але неўзабаве памёр. Яго пераемнік, Урбан VI, быў непапулярны сярод кардыналаў, і яны абралі іншага папу — Клімента VII, які зноў пасяліўся ў Авіньёне. Так пачаўся раскол, калі адначасова існавалі два (а пазней нават тры) па́пы, якіх падтрымлівалі розныя дзяржавы. Гэты крызіс, вядомы як *«Вялікая заходняя схізма» (1378–1417 гг.)*, цягнуўся амаль 40 гадоў і канчаткова падарваў давер да інстытуту папства. Толькі ў 1417 г. на *Канстанцкім саборы* схізма была спынена і такім чынам адноўлена адзіная папская ўлада. У выніку папства страціла свой былы ўплыў. Хоць па́пы працягвалі адыгрываць важную ролю, яны ўжо не маглі дыктаваць умовы каралям і імператарам. Заняпад папства ў Сярэднявеччы быў выкліканы як унутранымі крызісамі, так і знешнім ціскам з боку манархаў і грамадства.

У XIV–XV стст. усё большая колькасць людзей крытыкавала царкву за раскошу, карупцыю і продаж індульгенцый. Рэлігійныя рухі, такія як лаларды ў Англіі і гусіты ў Чэхіі, патрабавалі рэформаў. Вучоныя і багасловы, напрыклад Джон Уікліф і Ян Гус, выступалі за вяртанне да сапраўднага хрысціянства без лішняга ўмяшання пап ва ўнутраныя справы грамадства і дзяржавы. Рух за рэформы быў прадвеснікам пратэстанцкай Рэфармацыі ў XVI ст.

*Якія фактары паспрыялі занепаду ўплыву рымскіх пап у Познім сярэднявеччы?*



*Спаленне Яна Гуса. Мініяцюра. XV ст.*

Як вы лічыце, якія якасці асобы Яна Гуса прываблівалі яго сучаснікаў і нашчадкаў? Свой адказ аргументуйце.

**3. Гусіцкі рух.** Ян Гус — цэнтральная постаць гусіцкага руху, сімвал барацьбы за царкоўныя і грамадскія рэформы. Ён нарадзіўся каля 1370 г. у Паўднёвай Багеміі (Чэхія), атрымаў адукацыю ў Карлавым універсітэце і зрабіўся настаяцелем Віфлеемскай капліцы ў Празе. Гус прапаведаваў на чэшскай мове, крытыкаваў карупцыю ў царкве, заклікаў вяртацца да беднасці і прастаты ранняга хрысціянства. Ён адмаўляў боскае паходжанне папства і сцвярджаў, што яно паўстала толькі ў часы імператара Канстанціна Вялікага.

У 1410 г. Ян Гус адкрыта асудзіў продаж індульгенцый, што стала прычынай яго адлучэння ад царквы. У 1414 г. на Канстанцкім саборы ён быў узяты пад варту і асуджаны як ерэтык. Гус адмовіўся адрачыся ад сваіх поглядаў і 6 ліпеня 1415 г. быў спалены на вогнішчы. Яго смерць выступіла каталізатарам гусіцкіх войнаў, натхніла будучых рэфарматараў, у тым ліку Марціна Лютара ў Германіі.

Прычыны ўзнікнення гусіцкага руху можна разглядаць з некалькіх бакоў. Па-першае, слабасць улады чэшскага караля Вацлава IV і яго няздольнасць кантраляваць сілы рэфарматараў, што ў той час нараставалі, выступілі каталізатарам сацыяльнай

нестабільнасці. Кароль не здолеў наладзіць дыялог з незадаволенымі, што прывяло да росту пратэснага руху.

Па-другое, Вялікая схізма Рымскай царквы падарвала яе аўтарытэт, стварыла няпэўнасць сярод вернікаў. Гэты раскол аслабіў уплыў папства і вывеў на паверхню рэлігійныя спрэчкі.

Апроч таго, злоўжыванні духавенства, у тым ліку яго амаральны лад жыцця і хцівасць, выклікалі незадаволенасць у грамадстве. І, нарэшце, нацыянальны канфлікт паміж чэхамі і немцамі ў Багеміі таксама адыграў сваю ролю, бо чэшскі народ адчуваў уціск сваіх правоў. Усе гэтыя фактары ў сукупнасці паспрыялі з'яўленню гусіцкага руху, што выступаў за сацыяльную і рэлігійную справядлівасць.

Гусіцкі рух у Багеміі спалучаў рэлігійныя і палітычныя матывы. Ён паўстаў сярод гараджан і студэнтаў Карлава ўніверсітэта і зрабіўся сімвалам фарміравання нацыянальнай самасвядомасці чэхаў.

Смерць караля Вацлава IV у 1419 г. прывяла да радыкалізацыі гусіцкага руху. У Празе пачаліся хваляванні і крывавыя сутыкненні, падчас якіх адбыліся масавыя забойствы прадстаўнікоў каталіцкай царквы. Гусіты выставілі шэраг патрабаванняў, у ліку якіх былі свабода пропаведзі, прычасце для свецкіх людзей, сур'ёзныя рэформы ў царкоўнай іерархіі, а таксама абарона і замацаванне чэшскай мовы ў набажэнствах. Такія памкненні адлюстроўвалі глыбокую незадаволенасць сярод народа і жаданне перамен; гэта прывяло да далейшых важных падзей, якія аказалі ўплыў на ход чэшскай гісторыі і прадвызначылі пачатак гусіцкіх войнаў, што зрабіліся знакавымі для таго часу.

У 1420 г. папа Марцін V абвясціў крыжовы паход супраць Багеміі, што паклала пачатак гусіцкім войнам. Супраць гусітаў ваявалі каталіцкія саюзнікі, у тым ліку Каралеўства Польскае, нямецкія княствы

Чаму паход на гусітаў Папа Рымскі абвясціў крыжовым?

і рыцарскія ордэны, такія як Тэўтонскі і Мальтыйскі. Асноўныя сутыкненні адбываліся напачатку XV ст.

Унутры гусіцкага руху вылучаліся радыкальныя групы, такія як табарыты, якія адпрэчвалі традыцыйную царкоўную іерархію і выступалі за сацыяльныя перамены. Яны арганізавалі свае абшчыны на ўзгорку Табар і ініцыявалі актыўныя дзеянні, скіраваныя на знішчэнне рэліквій, канфіскацыю царкоўнай і арыстакратычнай уласнасці. Табарыты патрабавалі радыкальных змен у грамадстве, абвяшчалі ідэі роўнасці і сацыяльнай справядлівасці. Гэтыя дзеянні і ідэі адлюстроўвалі глыбокія рознагалоссі і пратэст супраць парадкаў, што ўсталяваліся ў Багеміі.



*Ян Жыжка.*
*Мініяцюра. XV ст.*

Растлумачце, чаму ворагі называлі Яна Жыжку «страшным сляпым» і баяліся аднаго яго імя.

Пад кіраўніцтвам Яна Жыжкі гусіты стварылі дысцыплінаванае войска. Яны выкарыстоўвалі разнастайную зброю, у тым ліку пікі, мячы і сякеры. Мелі гусіты і агнястрэльную зброю, такую як пішчалі і бамбарды, а таксама баявыя вазы для абароны і атакі, што было навіной для таго часу. Аднак празмерная радыкалізацыя поглядаў табарытаў прывяла да ўнутраных рознагалоссяў, а смерць Яна Жыжкі пакінула іх без выдатнага палкаводца.

Каталіцкая царква, зразумеўшы немагчымасць працягваць бясконцы канфлікт, у выніку вырашыла пайсці на перамовы. Паражэнне табарытаў пры Ліпане ў 1434 г. было адпраўным момантам для мірнага пагаднення, падпісанага ў 1436 г. Большасць радыкальных патрабаванняў паўстанцаў была адхілена. Гусіцкая царква была прызнана раўнапраўнай з каталіцкай. У далейшым яе паглынуў рэфармацыйны рух, калі ў Еўропе пачаліся больш маштабныя пратэстанцкія пераўтварэнні.

Гусіцкі рух, які паўстаў у XV ст. у Чэхіі, быў важным этапам у гісторыі хрысціянства і ранніх рэформаў. Ён змагаўся супраць карупцыі ў царкве, прапагандаваў ідэі роўнасці і доступу да Бібліі. Гэты рух

папярэднічаў Рэфармацыі, паўплываў на развіццё пратэстантызму і дэмакратычных ідэй у Еўропе.

*Якія сацыяльныя групы падтрымлівалі гусіцкі рух і чаму?*
*Як дзейнасць Яна Гуса паўплывала на рэлігійную свядомасць людзей у Чэхіі і за яе межамі?*

**4. Іўдаізм у эпоху Сярэднявечча.** Тэрмін «іўдаізм» паходзіць ад назвы яўрэйскага племя — калена Іуды. Гэтае племя было самае шматлікае сярод усіх 12 яўрэйскіх плямён. Яўрэйскія абшчыны здаўна існавалі амаль у кожным еўрапейскім горадзе. У часы Меравінгаў і пазней яўрэйскія купцы падтрымлівалі шчыльныя гандлёвыя сувязі паміж Заходняй Еўропай і Усходам. З гэтай прычыны многія еўрапейскія манархі ставіліся да яўрэяў прыхільна. Часам за сваё заступніцтва яны збіралі з яўрэяў адмысловы падатак. Яўрэі былі прыкметнай групай іншаверцаў, якія ізалявана жылі сярод сярэдневяковага хрысціянскага грамадства. Яны прытрымліваліся сваёй старажытнай рэлігіі — іўдаізму.

### ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

У шырокім сэнсе іўдаізм — гэта комплекс прававых, маральна-этычных, філасофскіх, у тым ліку і рэлігійных, уяўленняў, што вызначалі на працягу каля чатырох тысячагоддзяў лад жыцця яўрэяў.

У вузкім сэнсе іўдаізм — рэлігія, што паўстала на мяжы II–I тыс. да н. э. сярод яўрэйскіх плямён. У наш час гэтую рэлігію вызнаюць па ўсім свеце, але большасць яе прыхільнікаў жыве ў Ізраілі.

1. *Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы, высветліце, якія фактары паўплывалі на асаблівае стаўленне да яўрэяў у Познім сярэднявеччы.*
2. *Чаму сёння больш правільна выкарыстоўваць слова «іўдзей» у кантэксце рэлігійнай ідэнтычнасці, а не як указанне на этнічную групу?*

### 5. Асаблівасці рэлігій Усходу.

*Успомніце, якія рэлігіі былі пашыраны на Усходзе ў перыяд Сярэднявечча. Параўнайце дзве рэлігіі (на выбар) паводле наступных крытэрыяў: асноўныя вучэнні, свяшчэнныя тэксты, рытуалы і святы, роля рэлігіі ў грамадстве.*

Успомніце, што такое этнас.

Якую ролю адыгрываў рэлігійны фактар у развіцці культуры, мастацтва і філасофіі краін Усходу?

**6. Значэнне рэлігіі для этнічнай кансалідацыі.** У другой палове XIII — XV ст. рэлігія часта служыла элементам этнічнай ідэнтычнасці.

Вера і рэлігійныя абрады ўмацоўвалі пачуццё адзінства і сувязі паміж людзьмі. Цэрквы, мячэці і сінагогі былі не толькі месцамі набажэнстваў, але і цэнтрамі культурнай і сацыяльнай актыўнасці для розных груп насельніцтва. Рэлігійныя абрады і святы часта адлюстроўвалі і падкрэслівалі ўнікальныя культурныя асаблівасці этнічных супольнасцей, што ўключалі ў сябе мову, музыку, адзенне і кулінарыю.

Ва ўмовах палітычных і сацыяльных узрушэнняў рэлігія часта выступала фактарам адзінства і абароны этнічных меншасцей. Людзі аб’ядноўваліся вакол сваёй рэлігіі, каб бараніць свае інтарэсы і правы ў шматнацыянальных грамадствах.

У многіх выпадках рэлігія рабілася элементам палітычнай ідэнтычнасці. Манархі і іншыя ўладары маглі выкарыстоўваць рэлігію для ўмацавання сваёй улады і кансалідацыі этнічных груп пад сваім праўленнем. Напрыклад, прыняцце праваслаўя ўсходнімі славянамі паспрыяла іх аб’яднанню ў адной дзяржаве.

*Прывядзіце аргументы, якія даказваюць, што ў другой палове XIII — XV ст. рэлігія часта выступала як элемент этнічнай ідэнтычнасці.*

**7. Дасягненні ў навуцы і культуры Індыі, Кітая і Японіі.** Індыя, Кітай і Японія — старажытныя цывілізацыі, якія зрабілі велізарны ўнёсак у развіццё навукі і культуры. Кожная з гэтых краін мае свае ўнікальныя дасягненні, што адбіліся на далейшым развіцці сусветнай гісторыі.

У Індыі вялікія вучоныя распрацавалі мноства матэматычных і астранамічных канцэпцый. Індыйскія матэматыкі адкрылі нуль і распрацавалі сістэму лікавых значэнняў, што лягла ў аснову дзесятковай сістэмы лічэння. Яны таксама стварылі складаныя астранамічныя табліцы і вызначылі дакладныя пазіцыі планет.

Пасля ўтварэння Дэлійскага султаната і пашырэння ісламу ў Індыі з'явіліся элементы мусульманскай культуры, аднак яны не выцеснілі традыцыйную індуісцкую культуру, а пачалі з ёю ўзаемадзейнічаць, у выніку чаго паўстала арыгінальная і самабытная культура мусульманскай Індыі. Падчас узвядзення традыцыйных ісламскіх пабудоў — мячэцей і маўзалеяў — актыўна выкарыстоўваліся традыцыі індыйскага дойлідства.



*Кутб-Мінар. Дэлі. Індыя. Сучасны выгляд*



*Забаронены горад. Пекін, Кітай. Сучасны выгляд*

Пануючым тыпам архітэктурных збудаванняў у сярэдневяковым Кітаі былі пагады — будыйскія храмы ў выглядзе высокіх шматпавярховых вежаў з дрэва, каменю, бронзы і жалеза. У перыяд праўлення дынастыі Мін у Пекіне з'явіўся выдатны помнік кітайскай архітэктуры — імператарскі палац Гугун (Забаронены горад). Гэта найбуйнейшы ў свеце палацавы комплекс, створаны мільёнамі будаўнікоў і сотнямі тысяч мастакоў, майстроў разьбы па камені і дрэве, жывапісцаў.

Японія таксама мае багатую культурную і навуковую спадчыну. Яна ўключае каліграфію, тэатр Но і ўнікальнае мастацтва чайнай цырымоніі. Тэатр Но незвычайны для еўрапейцаў. Акцёры ў ім ігралі



*Маскі тэатра Но*



*Восеньскі пейзаж. Мастак Тоё Ода*

ў масках. Яны выяўлялі чалавечыя пачуцці не выразам твару, а голасам, рухамі цела і асабліва танцам. Прадстаўленне давалася на пляцоўцы, на якой разам з акцёрамі знаходзіліся хор і аркестр з трох барабанаў і флейты. Найчасцей ставіліся п'есы пра подзвігі самураяў, і тэатр Но зрабіўся ўлюбёным тэатрам самураяў. Просты ж народ любіў спектаклі, дзе акцёры і лялечнікі паказвалі смешныя сцэны з паўсядзённага жыцця.

Важнае месца ў мастацтве Японіі займае аднакалерная пейзажная графіка, росквіт якой прыпаў на другую палову XV ст. Выкарыстоўваючы толькі розныя адценні чорнай тушы, японскія мастакі, сярод

якіх надзвычай вядомы Тоё Ода, здолелі перадаць свет прыроды ва ўсёй яго разнастайнасці.

Усе гэтыя дасягненні ў навуцы і культуры Індыі, Кітая і Японіі з'яўляюцца вынікам шматвекавога развіцця і культурнага абмену. Гэтыя старажытныя цывілізацыі прадстаўляюць розныя падыходы і традыцыі, якія пакінулі свой адбітак на навуковых і культурных дасягненнях. Яны працягваюць натхняць і здзіўляць сучасны свет інавацыйнымі ідэямі і творчым падыходам.

Уявіце, што вам трэба выступіць на школьнай канферэнцыі па тэме «Дасягненні ў навуцы і культуры Індыі, Кітая і Японіі». Падрыхтуйце кароткую інфармацыю, якая праілюструе дасягненні ў навуцы і культуры адной з абраных краін, выкарыстоўваючы выявы, цытаты і кароткія апісанні.